Пралетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ЗА ЛЕНІНСКІЯ КАДРЫ

№ 2 (14)
26 лютага
1936 г.

Орган парткома і прафкома Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта

Няхай жыве непераможная Чырвоная армія!

18 ГОД РСЧА

18 год таму назад у агні грамадзянскай вайны нарадзілася першая ў свеце Чырвоная армія. Рабочы клас пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна падняў чырвоны сцяг камунізма на адной шостай частцы земнага шара. Усе сілы міжнароднага капітала абрушыліся на маладую соцыялістычную краіну. Але яны былі разбіты, разбіты рабоча-сялянскай Чырвонай арміяй.

Чырвоная армія ведала, за што змагаецца: наша армія—армія вызваленых рабочых і сялян, армія дыктатуры пролетарыята, армія брацтва паміж працоўнымі ўсіх нацый, армія абароны свабоды і незалежнасці народаў нашай краіны. Вось чаму ў барацьбе з белагвардзейшчынай ва ўмовах гаспадарчай разрухі Чырвоная армія перамагла, праяўляючы небывалы ў гісторыі гераізм.

Чырвопая армія—дзецішча Вялікай пролетарскай рэволюцыі. Партыя Леніна—Сталіна стварыла Чырвоную армію. Партыя Леніна—Сталіна натхніла яе на гераізм, на перамогі. Пад кіраўніцтвам партыі Чырвоная армія перамагла.

На больш небяспечныя і адказныя франты грамадзянскай вайны Ленін пасылаў таварыша Сталіна. Таварыш Сталін заўсёды паспяхова забяспечваў перамогу над ворагамі. Так было пад Царыцынам. Пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна разгромлен Калчак, разбіт Юдзеніч, вычышчаны інтэрвенты з Поўначы. Пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна вызвалена Украіна ад белапалякаў. Пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна білі ворагаў лепшыя большэвікі таварышы Кіраў, Куйбышэў, Орджанікідзе, Кагановіч. Пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна наша Чырвоная армія на страх ворагам абараняе мірнае будаўніцтва Савецкага Саюза. Партыя вылучыла са сваіх радоў кіраўнікоў армій тт. Фрунзе, Варашылава, Егорава, Тухачэўскага, Будзенпага, Блюхера. Гэта партыя дала армій легендарных герояў Чапаева, Шчорса.

Пасля грамадзянскай вайны партыя і ўрад ператвараюць Чырвоную армію ў магутную тэхнічна ўзброеную армію. «У мінулым у нас не было і не магло быць бацькаўшчыны, але цяпер, калі вецы агарод» (СТАЛІН).

мы зверглі капіталізм, а ўлада ў нас рабочая, у нас ёсць бацькаўшчына, і мы будзем адстойваць яе незалежнасць». (Сталін).

І ў гады першай і другой пяцігодкі партыя і ўрад тэхнічна перабудбройваю Чырвоную армію. У той час, калі ў 1925 годзе ў сярэднім на аднаго чырвонаармейца было 2,6 механічных конскіх сіл, то ў 1933 годзе іх прыходзіцца ўжо 7,74. Гэта значна вышэй, чым у перадавых буржуазных арміях.

Але акрамя тэхнікі, Чырвоная армія па праву ганарыцца сваімі камандзірамі і байцамі, якія пад кіраўніцтвам першага маршала Совецкага Саюза таварыша Варашылава, даюць узоры аўладання баявой і палітычнай падрыхтоўкай, аўладання тэхнікай і даюць прыклады сапраўднага гераізму. Наша Чырвоная армія выкавала такіх людзей, як Героі Совецкага Саюза Молокаў, Вадап'янаў, Левапеўскі, Ляпідзеўскі і Даронін. Усе ведаюць летчыкаў Еусеева, Мілешкіна; стратанаутаў Пракоф'ева, Зілле, Прылуцкага, Гадунова.

Стаханаўскі рух, стаханаўскія метады рояць нашага камандзіра, нашага байца майстрам сваёй справы. Нашы танкі будуць перамагаць усе перашкоды: змятаць усе прэграды, імчацца яшчэ хутчэй, паражаць ворага без промаху».

Гадавіну Чырвонай арміі мы сустракаем з новымі перамогамі на фронце соцыялістычнага будаўніцтва. Фашысцкая Германія, імперыялістычная Японія з кожным днём павялічваюць свае ўзбраенні, рыхтуючы напад на Совецкі Саюз. Наша армія — армія абароны мірнай працы Совецкага Саюза. Вось чаму ўвесь народ Совецкага Саюза з вялікім уздымам сустрэў рашэнне ўрада аб павелічэнні выдаткаў на абарону.

Магутная Чырвоная армія—верны вартавы совецкіх граніц. І ўсякі, хто падыме руку на краіну, якая будуе соцыялізм, будзе разбіт і знішчан. Па абарону нашай вялікай радзімы выступяць усе народы. «А тыя, якія папрабуюць напасці на нашу краіну,—атрымаюць сакрушальны адпор, каб падалей не павадна было ім соваць сваё свіное рыла ў наш совецкі агарод» (СТАЛІН).

К. Е. ВАРАШЫЛАЎ

СТАЛІН І ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ

(УРЫВАК З АРТЫКУЛА)*

У перыяд 1918 — 1920 гг. таварыш Сталін з'яўляўся, бадай, адзіным чалавекам, якога Цэнтральны Камітэт кідаў з аднаго баявога фронта на другі, выбіраючы найбольш небяспечныя, найбольш страшныя для рэволюцыі месцы. Там, дзе было адносна спакойна і ціха, дзе мы мелі поспехі, там не было відаць Сталіна. Але там, дзе ў сілу цэлага раду прычын трашчалі чырвоныя арміі, дзе контррэволюцыйныя сілы, развіваючы свае поспехі, пагражалі самаму існаванню совецкай улады, дзе замяшанне і паніка маглі ў любую мінуту ператварыцца ў бездапаможнасць, катастрофу, там паяўляўся таварыш Сталін. Ён не спаў начэй, ён арганізоўваў, ён браў у свае цвёрдыя рукі кіраўніцтва, ён ламаў, быў бязлітасным і стваряў пералом, аздараўляў абстаноўку. Сам таварыш Сталін пісаў аб гэтым у адным з пісем у ЦК у 1919 годзе, гаворачы, што «яго ператвараюць у спецыяліста па чыстцы канюшань ваеннага ведамства».

Царыцын

Сваю ваенную работу таварыш Сталін пачаў з царыцынскага фронта і даволі выпадкова. У пачатку чэрвеня 1918 года таварыш Сталін з атрадам чырвонаармейцаў і двума аўтабраневікамі накіроўваецца ў Царыцын у якасці кіраўніка ўсёй харчовай справай поўдня Расіі. У Царыцыне ён застае страшэнны хаос не толькі ў совецкіх прафесіянальных і партыйных арганізацыях, але яшчэ большую блытаніну і неразбярыху ў органах ваеннага камандвання. Таварыш Сталін на кожным кроку сустракае перашкоды агульнага характару, якія не давалі яму магчымасці выканаць яго прамую задачу. Гэтыя перашкоды абумоўліваліся перш за ўсё хутка узрастаючай казацкай контррэволюцыяй, якая атрымлівала ў гэты час вялікае падтрыманне ад нямецкіх акупантаў, заняўшых Украіну. Казацкія контррэволюцыйныя банды ў хуткім часе захватваюць рад бліжэйшых к Царыцыну пунктаў і гэтым самым не толькі зрываюць магчымасць планамернай загатоўкі хлеба для галадаючых Масквы і Ленінграда, але і для Царыцына ствараюць надзвычайную небяспеку.

Не лепш аостаіць у гэты час справа і ў другіх месцах. У Маскве адбываецца лева-эсэраўскае паўстанне, на Усходзе здраджвае Мураўёў, на Урале развіваецца і мацнее чэхаславацкая контррэволюцыя, на крайнім поўдні к Баку—падбіраюцца англічане. Усё гарыць у агнявым кальцы. Рэволюцыя перажывае найвялікшае іспытанне. Тэлеграма за тэлеграмай ляціць па правадах к таварышу Сталіну ў Царыцын ад Леніна і назад. Ленін папяроджвае аб небяспеках, адабрае, натрабуе рашучых мер. Становішча Царыцына набывае велзарнае значэнне. Пры паўстанні на Дану і пры страце Царыцына мы рызыкуем страціць увесь вытвараючы, багаты хлебны Паўночны Каўказ. І таварыш Сталін гэта выразна разумее. Як вопытны рэволюцыянер, ён хутка прыходзіць да пераканання, што яго работа будзе мець які-небудзь сэнс толькі пры ўмове, калі ён зможа рабіць уплыў на ваеннае камандванне, роля якога ў даных умовах становіцца рашаючай.

«Лінія на поўдзень ад Царыцына яшчэ не адноўлена»,—піша ён Леніну ў запісцы ад 7-га ліпеня, пераданай з характэрным надпісам: Спяшаюся на фронт, пішу толькі па справе».

«Ганю і ругаю ўсіх, каго трэба, спадзяюся—хутка адновім. Можаце быць упэўнены, што не пашкадуем нікога—ні сябе, ні другіх, а хлеб усё-ж дадзім. Калі-б нашы ваенныя «спецыялісты» (сапожнікі!) не спалі і не бяздзейнічалі, лінія не была-б прарвана; і калі лінія будзе адноўлена, то не дзякуючы ваенным, а наперакор ім».

І далей, адказваючы на непакой Леніна па поваду магчымага выступлення левых эсэраў ў Царыцыне, ён піша каротка, але цвёрда і ясна:

«Што датычыць істэрычных, будзьце ўпэўнены, у нас рука не дрогне, з ворагамі будзем дзейнічаць па-варожаму».

Усё больш прыглядаючыся да ваеннага апарата, таварыш Сталін ўпэўніваецца ў яго поўнай бездапаможнасці, а ў некаторай сваёй частцы—і ў прамым нежаданні арганізаваць адпор наглеючай контррэволюцыі.

І ўжо 11 ліпеня 1918 года таварыш Сталін тэлеграфуе Леніну:

«Справа ускладняецца тым, што штаб Паўночна-Каўказскай акругі аказаўся зусім не прыстасаваным да ўмоў барацьбы з контррэволюцыяй. Справа не толькі ў тым, што нашы «спецыялісты» псіхалагічна не здольны да рашучай вайны з контррэволюцыяй, але таксама ў тым, што яны як «штабныя» работнікі, якія ўмеюць толькі «чарціць чарцяжы» і даваць планы парафарміроўкі абсалютна раўнадушны да аператыўных дзеянняў... І наогул адчуваюць сябе як староннія людзі, госці. Ваенкомы не змаглі запоўніць прабел...»

Таварыш Сталін не абмяжоўваецца гэтай знішчальнай характарыстыкай, у гэтай-жа запісцы ён робіць для сябе дзейсны вывад:

«Глядзець на гэта раўнадушна, калі фронт Калыніна (камандуючы ў той час на Паўночным Каўказе.—В.) адарван ад пункта снабжэння, а Поўнач—ад хлебнага раёна, лічу сябе не ўправе. Я буду выпраўляць гэтыя і многія другія недахопы на месцах, я прымаю рад мер і буду прымаць аж да звальнення губячых справу чыноў і камандзіраў, не гледзячы на фармальныя затрудненні, якія пры неабходнасці буду ламаць. Пры гэтым, зразумела, што бяру на сябе ўсю адказнасць перад усімі вышэйшымі ўстановамі».

Абстаноўка рабілася ўсё больш і больш напружанай. Таварыш Сталін развівае каласальную энергію і ў самы хуткі час з надзвычайнага ўпаўнаважанага па харчаванню ператвараецца ў фактычнага кіраўніка ўсіх чырвоных сіл царыцынскага фронта. Гэта становішча атрымлівае афармленне ў Маскве, і на таварыша Сталіна ўскладаюцца задачы.

«Навесці парадак, аб'яднаць атрады ў рэгулярныя часці, устанавіць правільнае камандванне, выгнаўшы ўсіх непавінуючыхся» (з тэлеграмы РВС Рэспублікі з надпісам: «Гэта тэлеграма адпраўляецца па ўзгадненню з Леніным»).

К гэтаму часу к Царыцыну падыйшлі астаткі украінскіх рэволюцыйных армій, якія адступалі над націскам германскіх войск праз донскія стэпы.

На чале з таварышам Сталіным ствараецца Рэволюцыйны ваенны совет, які прыступае да арганізацыі

(ПРАЦЯГ НА 2-Й СТАРОНЦЫ).

*) Надрукавана ў зборніку да 50-годдзя са дня нараджэння тав. Сталіна.

МАРШАЛЫ СОВЕЦКАГА САЮЗА

Маршалы Совецкага Саюза. У цэнтры — К. Е. ВАРАШЫЛАЎ, злева — т. М. Н. ТУХАЧЭЎСКІ, справа — т. А. І. ЕГОРАЎ. Стаяць злева — С. М. БУДЗЁННЫ і тав. В. К. БЛЮХЕР.

Крывавы Нёман

(УСПАМІНЫ З ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ)

СПЕГАЛЬСКІ

...Пад'ём рот быў назначан на 24 гадзіны, з тым, каб на зыходным рубяжы для наступлення быць роўна ў 2 гадз. 30 мінут.

Была цихая, цёплая ноч. Месяц, нібы бязмоўны вартавы, ахоўваў цішыню сваімі халоднымі праменнямі і лашчыў расхрыстаныя тостаці байцоў. Лёгкі шолах лісцяў надаваў ночы нейкую таемнасць. Стрэлаў не чулася, ды не да гэтага зараз. Чароўная ноч навяла іншыя думкі—процілеглыя крывавай вайне. Хацелася хоць на момант забыцца. Але халодны бляск вінтовак, састаўленых у козлы на шэрым фоне сонцем спаўшых байцоў, варочаў да суровай сапраўднасці.

У 4 гадзіны ночы батальёны ўжо ішлі на зыходны рубеж. Шэрыя калоны рот зліваліся з цемрай ночы. Людзі ішлі, як здані, вусім бясшумна. Прыглушана пастуквалі колы кулямётных двуколак. Ва ўсім руху адчувалася нейкая «забарона» на ўсе гукі. Нават коні як быццам баяліся іржаць.

Роўна ў 2 гадз. 30 мінут батальёны на зыходным для наступлення рубяжы. Цішыня. Не чуваць галасоў і бразгатання колаў. «Забарона» на ўсе гукі пануе і тут.

Ужо ледзь-ледзь шарэе. Пачынаюць шчабятаць абуджаныя птушкі. Роты нерухома стаяць, чакаючы загаду.

Хочацца хутчэй на Нёман...

— Няўжо спяць?—хтосьці шапнуў у калоне.

— Спяць? Вось выйдзем з лесу, дык пазнаеш, як спяць.

— Тс-с,—стыняе шэпт камандзіра роты... і зноў ціха.

Прыглушанае драбязжанне тэлефоннага званка парушае цішыню першай ранцы.

— Я... Так... Разумею... Зараз пачынаю...

Кароткія ў паўголаса распараджэнні, і роты бясшумна разгортваюцца ў цэпі. Хутка без стрэлаў ідуць яны наперад, мякка шорхаючы нагамі па траве.

Першыя цэпі ўжо на ўскраіне лесу. Там, наперадзе, завуаляваны белай цымкай туману, відаць Нёман—галоўная бліжэйшая задача сённяшняга дня. О, Нёман! Быстры, глыбокі і шырокі Неман! Колькі ты сёння загубіш людзей, колькі ты крыві праглынеш!

Белагвардзейскія прыкмецілі вышаўшыя з лесу нашы цэпі і зараз-жа адкрылі кулямётны і ружэйны агонь. Разам узвілося некалькі рознакаляровых ракет, і іх артылерыя адкрыла агонь па лесу. Застагнаў лес, зароў, нібы паранены звер.

Застракаталі і нашы кулямёты, загрукатала артылерыя. Чуваць было, як загараўся бой у суседнім батальёне. Чакаць няма чаго, трэба—наперад, на Нёман. І шэрыя купкі людзей, прыгібаючыся па зямлі, хуткапрабягаюць некалькі секунд па рослай траве сенажаці, кідаюцца на зямлю і зноў адкрываюць агонь.

Першыя афяры. Кроў, стогны параненых і трупы забітых.

Радзеюць першыя цэпі, засцілаючы сабой пройдзены шлях. А з лесу смела ідуць усё новыя і новыя рады байцоў.

Агонь праціўніка мацнее ўсё больш і больш. Захлёбваюцца кулямёты ў шалёным стракатанні. Рушэйныя залпы рвуць досвітную рань злосна і працяжна. Іх грохат дапаўняе люты рэў артылерыі. Стогне і раве паветра і рохам аддаецца ў лесе. Дзесяткі слупоў зямлі ад узрываў снарадаў высока ўздымаюцца ўгару, зацямняюць сабой выпаўзаючае з-за гарызонту сонца. І яно становіцца бакрана-чырвоным.

А шэрыя цэпі чырвоных байцоў усё ідуць і ідуць уперад, к Неману, астаўляючы за сабой крывавы след. Заднія падганяюць пярэдніх, а пярэднія сваёй адвагай запаляюць задніх.

Вось і Нёман. Які ён дзівосны пад бліскучымі праменнямі ранішняга сонца. Хутка змяшаюцца яго зялёныя воды, журчаць, шапоча сяброўскі, што патрывожылі іх.

Пярэднія цэпі ўжо на беразе. Перад імі—воды Нёмана. Але-ж што воды Нёмана, калі там, на процілеглым беразе, закляты класавы вораг.

— За мною... уперад.—раздаецца голас камандзіра роты, і ён першым кідаецца ў Нёман. Дзесяткі чырвоных байцоў бясстрашна кідаюцца за сваім камандзірам.

Быстры і глыбокі Нёман з плескам прымае ў свае халодныя абдымкі купкі чырвоных байцоў, і праз невялікі час яго паверхня пакрываецца шэрымі цэламі забітых.

Наступае крытычны момант. Белагвардзейскі разявакоць шалены ўраганны агонь. З усіх бакоў накіраваліся яны сюды, на маленькі кавалачак Нёмана, сотні пудоў металу.

Бушуе і раве Нёман. Слупы вады разам з чалавечымі целамі дзесяткамі ўздымаюцца ўгару. Тысячы куль зрашэчваюць паверхню вады з пугам і свістам.

Крывавым становіцца Нёман.

Страшэнны грукат артылерыі, кулямётаў і вінтовак, крыкі і стогны людзей напаўняюць паветра і тлумачнай жудасцю стаяць у вушшу. Але чырвоныя байцы па горла ў вадзе няспынна ідуць, на той бераг Нёмана, каб там у штыкавой схватцы з заклятым ворагам выканаць баявы загад.

Ніхто і нішто не зможа спыніць іх адважнага наступу.

Вось ужо асобныя байцы на тым беразе. За імі дзесяткі... сотні. Рыхтуецца атака—самы адказнейшы момант бою.

— У атаку... за мной!—раздаецца каманда, і сотні байцоў, паліняючыся як адзін гэтаму воклічу, узнімаюцца з зямлі і імкліва ідуць уперад.

Бясстрашны твары байцоў. Нельхіснай рашучасцю перамагчы гараць іх вочы. Моцна сціснуты ў руках узятыя на перавес вінтоўкі.

Праціўнік узмацняе ўсё больш і больш свой агонь. Але позна.

Ура-а-а!.. Ура-а-а! — раздаецца магутны баявы клёч чырвоных рот, і яны бягом кідаюцца ў штыкі. Усяго толькі пару мінут працягнецца невялічкі кусочак поля, і там, у акопах праціўніка, вырашыць лёс бою.

Але не прымае штыкавога бою праціўнік, яму не пад сілу чырвоныя штыкі, і ён бяжыць, бяжыць, астаўляючы нам кулямёты, вінтоўкі, патроны...

Чырвоныя роты дружна праследуюць паноў, захватваючы іх у палоны цэлымі падраздзяленнямі.

«Камбрыгу 10,4 сд. Бліжэйшая задача, пастаўленая палку, выканана ў 11⁰⁰. Захвачана многа палонных, багатыя трафеі. Прыступаю да выканання наступнай задачы—наступлення на м. Лунно».

Перабежка на новую пазіцыю

ШТО ЧЫТАЦЬ

Грамадзянская вайна ў мастацкай літаратуры.

1. Эдуард Багрыцкі — «Дума про Опанаса».
2. Дзем'ян Бедны—«Красноармеец Иванов».
3. В. Вішнеўскі — «Первая конная».
4. Іваноў — «Партизанские повести».
5. Лебедзінскі — «Неделя».
6. Серафімовіч — «Железный поток».
7. Фадзееў — «Разгром».
8. Фурманаў — «Чапаев», «Мятеж».
9. Шолахаў — «Тихий Дон».
10. Стаўскі — «Сильнее смерти».
11. Ясноўскі — «Всадники».
12. Астроўскі — «Как закалялась сталь».
13. Колас — «Дрыгва».
14. Фінн Г. — «Мы вернемся, Суоми».

К. Е. ВАРАШЫЛАЎ

СТАЛІН І ЧЫРВОНА АРМІЯ

(*КАНЕЦ УРЫУКА*)

рэгулярнай арміі. Кіпучая натура таварыша Сталіна, яго энергія і воля зрабілі тое, што здавалася яшчэ ўчора немагчымым. На працягу самага кароткага часу ствараюцца дывізіі, брыгады і палкі. Штаб, органы снабжэння і ўвесь тыл радыкальнейшым чынам ачышчаюцца ад контррэволюцыйных і варожых элементаў. Совецкі партыйны апарат паляпшаецца і падцягваецца. Вакол таварыша Сталіна яднаецца група старых большэвікоў і рэволюцыйных рабочых і замест бездапаможнага штаба, вырастае на Поўдні ляварот контррэволюцыйнага Дона, чырвоная большэвіцкая крэпасць.

Царыцын у той перыяд быў пераполнен контррэволюцыянерамі рознастайных масцей, ад правых эсэраў і тэарыстаў да махровых манархістаў. Усе гэтыя паны да паяўлення таварыша Сталіна і прыбыцця рэволюцыйных атрадаў з Украіны адчувалі сябе амаль свабодна і жылі, чакаючы лепшых дзён. Каб забяспечыць рэарганізацыю чырвоных сіл на фронце, трэба было жалезнай бязлітаснай мятлой прачысціць тыл. Рэўваенсовет на чале з таварышом Сталіным, стварае спецыяльную Чэка і ўскладае на яе абавязак ачысціць Царыцын ад контррэволюцыі.

... Кіраўніцтва таварыша Сталіна не абмяжоўваецца габінетам. Калі неабходны парадак наведзен, калі адноўлена рэволюцыйная арганізацыя, ён адпраўляецца на фронт, які к таму часу расцягнуўся больш чым на 600 кілометраў. І трэба было быць Сталіным і мець яго буйнейшыя арганізатарскія здольнасці, каб не маючы ніякай ваеннай падрыхтоўкі (таварыш Сталін ніколі не служыў на ваеннай службе!), так доб-

ра разумець снецыяльныя пытанні ў тагочаснай надтруднай абстаноўцы.

Памятаю, як цяпер, пачатак ня 1918 года. Красноўскія к часці вядуць наступленне на цын, прабуючы канцэнтрычны рам адкінуць чырвоныя палкі гу. На працягу многіх дзён чы войскі на чале з комуністычн візіяй, якая поўнасцю склада рабочых Данбаса, адбіваюць люччай сілы націск бліскуч нізаваных казацкіх часцей. Г лі дні найвялікшай напруж Трэба было бачыць таварыш ліна ў гэты час. Як заўсёды, с ны, углублены ў свае мыслі, таральна цэлымі суткамі не размяркоўваючы сваю інтэн шую работу паміж баявымі п ямі і штабам арміі. Становіш фронце станавілася амаль ка фічным. Красноўскія часці, п мандаванием Фіцхалаурава, Ма ва і іншых, добра прадуманы неўрам, цяснілі нашы змо нёшыя вялікія страты Фронт праціўніка, пабудаван ковай, якая ўпіралася сваімі гамі ў Волгу, з кожным днём каўся ўсё больш і больш. У было шляхоў адыходу. Але аб іх і не клапаціўся. Ён бы нікнут адзінай свядомасцю, думкай—перамагчы, разбіць ва што-б там ні стала. І гэта крушальная воля Сталіна пер лася ўсім яго бліжэйшым са кам, і не гледзячы на амаль ходнае становішча, ніхто не ваўся ў перамозе.

І мы перамаглі. Разгромлен раг быў адкінут далёка к Дон

НА ФРАНТАХ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ

(Успаміны тав. МІСУНА)

1918 год. Я быў тады на Украіне. У раёне Юзаўкі наступаў чырвонагвардзейскі атрад, які змагаўся супроць генерала Каледзіна.

Успамінаецца такі выпадак. Наш маленькі атрад з рабочых—шахцёраў знаходзіўся на Нова-Якаўлеўскім рудніку. За 5 кілометраў на Рыкаўскім рудніку размясцілася казачая белагвардзейская банда. Яны рыхтавалі ўдар на наш рудзік. Акрамя вінтовак, у нас быў кулямёт. Наш атрад раздзяліўся на чатыры групы. Я быў каля кулямёта, які стаяў на вежы царквы.

Казакі вусім ужо блізка. Мы чуем іх каманду. Мы бачым, як на сонцы блішчаць іх шаблі. Наш камандзір аддаў каманду «агонь» і страката ў нас кулямёт. Мы ку адбілі гледзячы на што бела двойцы значна лепш брсены. Мы былі моцны вісцю да эксплаататараў.

Разам з чырвонагвардзейскім радам, які ўліўся ў Чырвоную мію, у 1920 годзе я знаход на заходнім фронце. Мне было 17 год. Наш атрад за далёка ў тыл белым. Каб не зусім адрэзанамі ад сваіх, адыходзіл. Мне дал адказнае заданне — перанесці праз белых дакументы, грошы і капітоўнасці Мядзельскага во кома. Усе мае думкі былі цэнтраваны на выкананні задання. І я яго выканаў.

Дазорны.

Умацоўваем абарону краіны

Арганізацыя Асоавіяхіма БДУ налічвае 920 членаў, з іх 410 «варашылаўскіх стралкоў» першай ступені і 16 — другой ступені. У гэтым навучальным годзе «варашылаўскіх стралкоў» падрыхтавана 135 чалавек, выпушчана 10 планерыстаў першай ступені. Здалі нормы на значок ГСА 133 чалавекі. Усе студэнты першых курсаў прайшлі камеру газаакурвання. Зараз ідзе здача норм супроцьпаветранай і хімічнай абароны. Гэтыя нормы здалі ўжо 375 чалавек.

Лепш за ўсіх арганізаваў работу па здачы норм супроцьпаветранай і хімічнай абароны арганізатар АСО хімфака тав. Марголін. У выніку хімфак выйшаў на першае месца (124 здаўшых нормы). На другое месца выйшаў біяфак (90 чалавек).

Трэба сказаць, што як комсамольская, так і профсаюзная арганізацыі біяфака вельмі мала дапамагаюць тав. Коўшару ў справе арганізацыі абароннай работы на факультэце.

Але калі хімфак і біяфак па здачы норм занялі першае і другое месца, то зусім дрэнна абстаіць справа ў стралковых спаборніцтвах, дзе хімфак і біяфак займаюць апошнія месцы.

Вельмі слаба праводзіцца работа па здачы норм супроцьпаветранай і хімічнай абароны на гістфаку і геафаку. Арганізатар АСО гістфака тав. **Машчыцкі** ў апошні час зусім нічога не робіць, а комсамольская і профсаюзная арганізацыі ніякіх мер не прымаюць.

Найлепш арганізавана работа АСО на рабфаку, дзе акуратна працуюць гурткі, часта праводзіцца стралковая трэніроўка і ў кожнай групе праведзена па адной лекцыі ў супроцьгазах. Лепшымі ўдарнікамі абароннай справы на рабфаку з'яўляюцца тт. Крот, Аўчыннікаў, Міхеда, Кульбіцкі і Касаткін.

18 лютага быў праведзены стралковыя спаборніцтвы, на якіх першае месца заняў геафак і другое — рабфак. Індывідуальнае пярэдынства атрымалі тт. **Магіленко** (студэнт геафака)—першае месца і тав. **Гроскрзйц** (студэнтка геафака) — другое месца. Трэцяе месца падзялілі паміж сабой тав. **Гурыновіч** (біяфак) і **Касаткін** (рабфак).

На ўсіх факультэтах арганізаваны гурткі ГСА. Але іх работа зрываецца па віне совета Асоавіяхіма, які да гэтага часу не забяспечыў гурткі хімфака і геафака кіраўнікамі.

Трэба адзначыць, што студэнцкія советы ў інтэрнатах нічога не робяць па арганізацыі абароннай работы. А работы вельмі многа. Студэнцкім советам трэба ў першую чаргу арганізаваць ваенныя гурткі, забяспечыўшы іх вучэбнымі вінтоўкамі, супроцьгазамі і літаратурай.

Зараз праводзіцца абмен білетаў на адзінны асоавіяхімаўскі білет. Гэта кампанія павінна стварыць новы стымул для разгортвання абароннай работы.

БУЯКОЎ

Лепшыя «варашылаўскія стралкі» БДУ.

На здымку тав. Магіленка — студэнт геафака ў стралковым спаборніцтве заняў першае месца. Тав. Гроскрэц Зіна — студэнтка геафака заняла другое месца. Абодва прэміраваны.

Камандуючы войскамі Беларускай ваеннай акругі тав. Убарэвіч І. П. — камандарм І ранга.

Больш увагі фізкультуры

Партыя і ўрад многа удзяляюць увагі фізкультурнай рабоце, фізічнаму выхаванню моладзі. Барацьба за фізічнае выхаванне—гэта адна з чэноўных частак барацьбы за новую соцыялістычную культуру, за новы соцыялістычны быт.

Наша фізкультурная арганізацыя паставіла перад сабой задачу—ахапіць усіх студэнтаў здачай лімовых норм на значок ГПА першай і другой ступені. Згодна плана, наш універсітэт павінен даць у гэтым годзе 500 значкістаў ГПА першай ступені, 55 другой ступені і ахапіць значную колькасць студэнтаў рознымі фізкультурнымі секцыямі — хакейнай, боксу, гімнастычнай, баскетбольнай і т. д.

Калі да выпрацоўкі плана было многа мітусні, нарад, пасяджэнняў, дык затое гэты перыяд змяніўся ноўным зацішшам. Замест выканання кантрольных лічбаў, у бюро фізкультуры пачаўся перыяд перадачы партфеля ад Бражанскага да Жахаўца, ад яго да Косара.

На сённяшні дзень значкістаў ГПА першай ступені налічваецца толькі каля 50 чалавек. Значкістаў другой ступені няма ніводнага. З арганізаваных секцый лыжная і канькабежная зусім не працуюць. Амаль такое-ж становішча і з іншымі секцыямі. Толькі секцыя боксу большменш разгарнула сваю работу, ды і то дзякуючы ініцыятыве тав. Частоўскага.

Аб слабай рабоце бюро фізкультуры і фізкультурных арганізатараў факультэта сведчыць хоць-бы той факт, што на лыжныя спаборніцтвы 18 лютага геафак, замест 10 чалавек, даў толькі трох (фізорг Шырай) і гістфак, замест 10 чалавек, даў 6 (фізорг Фэрдэр).

З другога боку, нельга не адзначыць поўнай незацікаўленпасці работай фізкультурных гурткоў і здачай норм з боку выкладчыка фізкультуры тав. **Палянснага**, які лічыць, што справа гурткоў яго не датычыцца.

Бюро фізкультуры павінна неадкладна перабудаваць сваю работу, каб стаць на вышыні тых задач, якія стаяць перад фізкультурнымі арганізацыямі.

А. СМОТКІН.

Спаборніцтва на пярэдынства

18 лютага 1936 года адбыліся спаборніцтвы па лыжах на пярэдынства факультэта БДУ.

Кожны факультэт павінен быў выставіць чатыры каманды на дыстанцыі: для мужчын—20 і 10 кілометраў, для жанчын—5 і 3 кілометры.

Роўна ў 10 гадзін пачалі збірацца ўдзельнікі спаборніцтваў. Старт за горадам. Першай ідзе каманда на 20 кілометраў, за імі астатнія. Вынікі спаборніцтваў паказалі, што сярод нашых студэнтаў-фізкультурнікаў ёсць многа такіх, якія далі час праходжання 20 кілометраў блізкі да усебеларускага рэкорду. З іх лепшыя: Грыневіч (геафак), Малюкевіч (гістфак), Брыж, Барысевіч (фізмат), Сіпнеўская (біяфак). Але разам з гэтым спаборніцтвы паказалі, што ў нас вельмі многа недахопаў у фізкультурнай рабоце. У час спаборніцтваў не было належнага парадку ў арганізацыі маршрута каманд, а таму каманды перашкаджалі адна другой. Лыжы не былі забяспечаны мазкай. Спаборніцтвы пачаліся з вялікім спазненнем. Некаторыя факультэты (геафак) не далі поўнага складу каманд.

КОСАР.

Рэалізацыя білетаў 10 латарэі АСО

Кантрольна лічба рэалізацыі 10 латарэі Асоавіяхіма для БДУ — 2.000 руб. Па факультэтах білеты раздадзены 19 лютага г. г. К сённяшняму дню па ўдарнаму рэалізоўваючы на першым месцы знаходзіцца геафак, які рэалізаваў білетаў на 270 рублёў.

Лепшымі арганізатарамі гэтай справы на факультэце — студэнты: т.т. Рошчын, Грашанеў, Пісараў. Студэнт II-га курса Цэханскі ўзяў шэсць білетаў.

Другое месца займае фізмат і за ім хімфак.

Вельмі адстае гістфак, там тры кутпік груп і арганізатары АСО груп (першы курс—1—3 група) зусім не займаліся яшчэ гэтай справай. Такія арганізатары цягнуць факультэт на апошняе месца.

Мясцком для рэалізацыі білетаў сярод навуковых і адміністрацыйна-тэхнічных работнікаў трымае сувязь з дэканатам, якія адносяцца парознаму; калі дэкан фізмата тав. Гельфанд па-сур'ёзнаму аднёсся і сам рэалізоўваў білеты, дык зусім па другому аднесліся дэканаты: біяфака, геафака, якія яшчэ не разварушыліся.

Раўняючыся па перадавых падўдарнаму рэалізуем астачу білетаў па ўсіх факультэтах.

БУЯКОЎ.

ПЕРАМОЖЦЫ ЛЫЖНАГА СПАБОРНІЦТВА

На здымку тав. Грынкевіч — студэнт г еафака заняў першае месца ў лыжным спаборніцтве на 20 клм. Тав. Сіпнеўская — студэнтка геафака заняла першае месца на 3 клм. Тав. Барысевіч—студэнтка фізмата заняла першае месца на лыжах (5 клм.) і канькох. Усе прэміраваны.

У БАЯХ З КОНТРРЭВОЛЮЦЫЯЙ

(З успамінаў удзельніка грамайзянскай вайны студэнта гістфака ПРАНОВІЧА).

Наш атрад арганізаваўся ў самым пачатку 1918 г. у горадзе Ржэве. Арганізатарам і кіраўніком яго быў рабочы-большэвік тав. **Румянцэў.**

Улетку 1918 года частка нашага атрада, у тым ліку і я, пад камандай члена большэвіцкай партыі тав. Грацынскага была накіравана пад горад Казань на барацьбу з чэхаславакамі.

Пасля надзвычай жорсткіх, крывапралітных баёў наш атрад, злучыўшыся з трыма іншымі атрадамі, 5 верасня 1918 года ачысціў Казань ад белагвардзейскіх войск. Я перад наступленнем на Казань быў абран камандзірам кулямётнага ўзвода. Наш атрад у баю ля Казані панёс надзвычай вялікія страты. З трохсот чалавек у атрадзе засталося толькі сорак. Загінуў і наш баявы камандзір тав. Грацынскі.

***

Затым чатыры атрады, якія прымалі ўдзел у вызваленні горада Казані ад белагвардзейцаў, аб'ядналіся ў атрад асобага назначэння імя таварыша **Свердлова.**

***

За некалькі кіламетраў ад Казані ў мястэчку Свіяжск быў размешчан абоз і лазарэт з раненымі ў баях за Казань. Белагвардзейская рота, якая складалася з адных толькі афіцэраў у 300—400 чалавек, карыстаючыся цемнатой ночы, непрыкметна падабралася да самага мястэчка, зняла перадавыя дазоры, і раніцой, калі начная цемень пачала ледзь-ледзь рассейвацца, азвярэлыя афіцэры напалі на раненых байцоў і мірнае насельніцтва мястэчка.

Усе чырвонаармейцы, хто толькі мог падняцца на ногі, узяліся за зброю. Хворыя, з перавязанымі нагамі, рукамі, галовамі, ледзь падымаючыся з зямлі, кідаліся ў контратаку. Некалькі раз даходзіла да рукапашных схваток. Адзін з кулямётчыкаў, які знаходзіўся ў лазарэце, залегшы за кулямёт, адбіў некалькі атак ацалеўшых з поўдня на лазарэт. Пасля шматгадзіннага бою белыя вымушаны былі адступіць.

***

У кастрычніку 1918 года мы падыходзілі да вёскі Бугы. Вёску, якая налічвае да трох тысяч дварoў, ахоўвалі вялікія сілы працоўніка. Над прыкрыццем сваей артылерыі і кулямётаў мы падыходзілі да вёскі. З-пад кожнай страхі, з-за кожнага вугла ўспыхвалі агні стралаў ворага. На левым фланзе нашы перадавыя часці ўжо ўварваліся ў вёску і выцеснілі аптуль працоўніка. Чырвонаармейцы з ярасцю біліся ў рукапашным баі за кожны вяршок тэрыторыі. Зыход бою вырашыла кулямётная каманда, якая своечасова адкрыла агонь па флангу працоўніка. Насельніцтва вельмі радасна сустрэла прыход чырвоных.

***

У жорсткіх схватках наш атрад падыходзіў да важнейшага стратэгічнага пункта белых—горада Белебея. Горад быў надзвычай умацаван, і ўзяць яго лабавой, атакай было немагчыма. Карыстаючыся прыкрыццем ночы, наш атрад пасля тлюоката аховду прабраўся ў тыл працоўніка. Раніцой пачаўся бой. Нашы часці падыходзілі да самага горада. Белагвардзейцы аказвалі жорсткае супраціўленне. Вялікай перавагай на баку працоўніка была наяўнасць у іх бронепоезда. Артылерыйскія снарады з бронепоезда пераляталі далека за наш атрад, не трывожачы нам ніякай шкоды. Кулямёты яго падымалі слупы снегу ў бок ад месца размяшчэння нашых часцей. Чым бліжэй падыходзіў бронепоезд, тым далей ад нас ляцеў яго кул. У рашучы момант, калі нашы часці перайшлі ў атаку і былі ўжо на подступах к гораду, бронепоезд, вырваўшыся з франтавой паласы працоўніка, падняў чырвоны сцяг і адкрыў агонь па ўмацаваннях белагвардзейцаў. Гэта рэзультат праведзенай там комуністамі работы. Белагвардзейцы, пакінуўшы многа афяр і зброі, адступілі і не маглі ўжо аказаць нам супраціўлення. Пасля разгрому белагвардзейскіх сіл каля Белея мы ўдзел у баях ля станіц Мамоны, заняві горад Бугульму.

У гарматы.

У снежні 1918 года наш атрад адклікалі ў рэзерв у горад Петраград, дзе мы тры месяцы адпачывалі на Выбаргскай старане на патронным заводзе. Тут наш атрад рэарганізавала ў 56 дывізію. Даўшы вялікае папаўненне, нас накіравалі на Калчакоўскі фронт пад горад Вятку. Пасля раду надзвычай жорсткіх баёў Калчак быў разбіт. Наша часць чатыры фазы прымала ўдзел ім вялікіх баях.

Насля ліквідацыі калчакоўскага фронта нас перакінулі на дзенікінскі фронт. Наша часць прымала ўдзел у баях ля станцыі Мамоны, Нілушы, Мілаватка, хутар Сабацкі, станцыя Вараб'еўка і іншыя. Тут я з адным з таварышоў папаў у паалон да белых. Карыстаючыся выпадкам, уцёк і для сваіх часцей прынёс надзвычай каштоўныя весткі аб размяшчэнні сіл ворага.

Першая конная армія пад кіраўніцтвам таварышоў Варашылава і Будзённага разбіла генерала Дзенікіна і ачысціла поўдзень ад белагвардзейцаў.

15-га снежня 1922 года, я дэмабілізаваўся з Чырвонай арміі і разам з усёй Совецкай краінай перайшоў на мірнае соцыялістычнае будаўніцтва.

Запісаў **КАНСТАНЦІНАЎ.**

ДЗЕНЬ КОМСОРГА

Работа комсорга фізмата тав. Шайкевіча пачынаецца з першага перапынку. Ён хутка накіроўваецца на першы курс, знаходзіць ваенна - фізкультурнага работніка, камсамольца Зельдзіна. На фізмаце 88 камсамольцаў, з іх ніхто не ўсе здалі нормы ГПА і «варашылаўскага стралка». І вось яны сумесна абмяркоўваюць, як лепш наладзіць ваенна-фізкультурную работу на факультэце.

Звініць званок. На трэцім курсе фізікаў, студэнтам якога з'яўляецца Шайкевіч, працягваецца другая лекцыя варыяцыйнага ліч-ння. Ён спяшаецца на заняткі.

На трэцім перапынку комсорг вядзе гутарку з арганізатарам палітвучобы факультэта — камсамольцам Мельнікам. Сёння—дзень палітвучобы. Тэма заняткаў і літаратура загадзя вядомы ўсім студэнтам. Трэба толькі дабіцца 100-проц. наведвання. І комсорг Шайкевіч, сустракаючы камсамольскіх арганізатараў курсаў—тт. Качынскага, Мелніка, Тарасевіча, яшчэ раз напамінае ім аб гэтым.

Тры гадзіны. Лекцыя скончаны. На сённяшні дзень яшчэ многа работы. Тав. Шайкевіч наведвае гурток па вывучэнню класікаў марксізма. Гурток пачынае працаваць у 6 гадзін.

Палова дзесятай. Вечар на зыходзе, а заўтра спецпрактыкум, да якога неабходна падрыхтавацца. Шайкевіч рыхтуе «выміранне вялікіх супрацьўленняў гальванаметрычным спосабам».

Позна вечарам мы застаем Шайкевіча за даволі аб'ёмістай кнігай, якую ён з захапленнем чытае: Зацікавіўшыся, я адкрываю ўкладку, на якой значыцца Онорэ Бальзак «Эжэні Гранде».

В. ЗІНГЕР.

МЫ ЗАДАВОЛЕНЫ ПЕДПРАКТЫКАЙ

Зараз студэнты чацвертых курсаў універсітэта праходзяць педпрактыкум. Група студэнтаў хімфака, якая накіравана на педпрактыкум у Белпедтэхнікум, вельмі задавольна арганізацыяй і пастаноўкай практыкума.

Нас ветліва і цёпла сустрэлі выкладчыкі белпедтэхнікума. З першага дня практыканты былі размеркаваны па групах, і кожны ведаў, дзе ён будзе практыкавацца, чытаць лекцыі. Нас своечасова азнаёмілі з навучальнымі планамі і праграмамі тэхнікума.

У тэхнікуме можна многа павучыцца ў сэнсе арганізацыі педпрацэса і методыкі выкладання. Асабліва задаволены студэнты выкладчыкам хіміі, які вельмі добра чытае сваю дысцыпліну. Тав. Аўсяннікаў для лепшага азнаямлення студэнтаў з педпрацэсам і методыкай выкладання хіміі аддаў свой выходны дзень, за што студэнты яму вельмі ўдзячны.

Мы адчуваем, што ад сваей педпрактыкі атрымаем многа і многа для нас карыснага.

Студ. 4 курса хімфака ЭЛЕНТУХ.

Кансультацыя прапагандыстаў у партгабінеце.

Спаборніцтва на лыжах.

— АБМЕН ВОПЫТАМ —

МАЯ ДЫПЛОМНАЯ РАБОТА

У часе летніх канікул 1935 года ія быў на вытворчай практыцы ў Мазырскім і Тураўскім раёнах па вывучэнню расліннасці балот і вазёр. Будучы на практыцы, я адначасова загатовіў матэрыял і для сваёй дыпломнай работы: сабраў гербарый, мікрафлорый і матэрыял па мікрафлорыях некаторых вадаёмаў ракі Прыпяці.

Цяпер пішу дыпломную работу на тэму: «Эпіфітныя водарасці мікрафлоры вадаёмаў басейна ракі Прыпяці». Ужо закончыў маціроўку і азначэнне прадстаўнікоў флоры для гербарыя, прыступіў да вызначэння мікраскапічнай расліннасці (водарасцей) і чытання адпаведнай літаратуры. Першыя шагі вызначэння мікрафлоры даюцца даволі цяжка, бо галоўныя дапаможнікі па мікрафлоры напісаны на нямецкай і англійскай мовах. Апісанняў водарасцей ракі Прыпяці ў літаратуры яшчэ няма, і дыпломная работа з'явіцца першай спробай у гэтай галіне.

Хачу адзначыць вялікую зацікаўленасць і ўвагу з боку кіраўніка дыпломнай работай дацэнта О. Д. Акімавай, якая аказвае мне значную дапамогу.

Студэнт 4 курса біяфака В. ЗЕНБЧЫК.

МАЛЕНЬКІ ФЕЛЬЕТОН

„...І сажань роўны метру"

На першым курсе гістфака лекцыя пачалася так:

— Тапаграфія... Ну... ды гэта вы разумееце... Ну, ёсць вышэйшая геадэзія, а гэта... будзе нізэйшая.

Студэнт, які сядзеў за першым сталом, падняў вочы, здзіўлена раскрыў рот, чакаючы далейшага тлумачэння.

— Тапаграфія падзяляецца на проста тапаграфію і вайсковую тапаграфію. Проста тапаграфія—гэта простая тапаграфія, а вайсковая—гэта вайсковая тапаграфія.

Закончыўшы гэта «навуковае тлумачэнне» выкладчык пайшоў далей, і калі справа дайшла да маштабу, то ўсе нядзеі студэнтаў атрымаць якія-небудзь веды па тапаграфіі, адразу рухнулі.

— Вось, напрыклад, дадзен маштаб 1:42.000. Гэта ў старых мерках, а нам трэба перавесці ў мецрычныя.

Выкладчык робіць доўгія нудныя вылічэнні на дошцы. Нічога не выходзіць. Сцірае, пачынае спачатку. Зноў нічога не атрымалася. Нервуе, кідаецца ад стала да дошкі з прамяцью глядзіць у канспект, думае... зноў робіць вылічэнні, зноў і зноў...

Голас падае ўсё ніжэй і ніжэй. Выкладчык з «храбрага паэня» ператвараецца ў вучня, які не ведае задачы. Буйны па гарошыне пот выступіў на яго тварыс Доўга глядзіць у свой спадарожнік-канспект, выцірае пот рукавом, зноў бярэцца за вылічэнні.

Нарэшце, калі другая гадзіна падыходзіла к канцу, атрымалася, што калі лікавы маштаб 1: 42.000 перавесці ў мет[illegible] атрымліваецца, [illegible] карце роўны 50 [illegible] повасці, а па старарускіх вёрстах той-жа карце, пры [illegible] на штабе 1 дзю[illegible] рабінцы—50 сажням, а адсюль 500 сажэ[illegible] няецца 500 метрам, а сажань роўняецца метру.

На гэтым [illegible] дзённая лекцыя тав. Пі[illegible]са.

Ясна, што, апрача марнай траты часу, студэнты нічога [illegible] лекцыі не вынеслі. Гэта толькі патрачаная ніхто адна [illegible] падагульненне. Выкліканая вядо[illegible] ніца вучобы не магла нават успомніць, што гаварыла на мінулай лекцыі.

Вось яшчэ адзін маленькі фрагмент з другім выкладчыкам геадэзіі тав. **Смоткіным.** Ён тлумачыць аддачу вынтоўкі пры стральбе:

— Парахавыя газы ціснуць на ўсе бакі з аднолькавай сілай. Таколькі куля выкідваецца з ствала вінтоўкі з сілай у 2850 атмасфер, то і вінтоўка ўдарае ў плячо стралка з такой-жа сілай. Цікава што-б было калі-б пры стральбе з тав. Смоткіным хоць раз спрабавалася яго тэорыя?!

Кіраўніцтву ваеннай кафедры трэба больш сур'ёзна адносіцца да падбору выкладчыкаў. Бываць на лекцыях, правяраць і дапамагаць ім у рабоце.

Ф. КАНСТАНЦІНАЎ

УДЗЕЛЬНІК ЛЫЖНАГА СПАБОРНІЦТВА

НА ЗДЫМКУ. — Брыш — студэнт фізмата — у спаборніцтве па лыжах заняў першае месца (дыстанцыя 10 клм.).

ЭКСКУРСІЯ Ў МАСКВУ

Прафком БДУ ў часе зімовых канікул накіраваў групу студэнтаў у 20 чалавек на экскурсію ў Маскву. У гэту групу ўвайшлі выдатнікі і лепшыя ўдарнікі вучобы: Камянецкі, Рыбская, Цытерман, Гольдзіна, Канюшка, Петровіч і іншыя.

За восем дзён, якія экскурсанты прабылі ў Маскве, наведалі Дзяржаўны акадэмічны тэатр, тэатр аперэты, філіял Акадэмічнага тэатра, Цэнтральны дом Чырвонай арміі і інш. Наведалі музеі: гісторычны, музей рэвалюцыі, антрапалагічны. Былі ў Траякоўскай галерэі. Асобныя групы экскурсантаў наведалі музей у Асташкаве, політэхнічны музей і антырэлігійны. Былі ў камбінаце «Правда», дзе нас пазнаёмілі з працэсам друкавання газеты на навейшых машынах. Асабліва нас здзівіла маскоўскае метро, з якога студэнт Камянецкі нават і выходзіць не хацеў. І шмат чаго іншага бачылі мы там. У маўзалей Леніна студэнты хадзілі некалькі раз.

Цэнтральнае бюро пролетстуда арганізавала сустрэчу з выдатнікамі вучобы Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта, Свердлоўскага універсітэта і Маскоўскага інстытута гісторыі і філасофіі. На гэтай сустрэчы мы падзяліліся вопытамі нашай вучобы. Трэба адзначыць тую цеплую таварыскую сустрэчу, якую нам аказалі кіраўнікі і студэнты з Інстытута гісторыі і філасофіі, у інтэрнаце якога мы жылі.

Студэнты ад экскурсіі ў захапленні.

В. ФАМІН.

СУСТРЭЧА З ПІСЬМЕННІКАМІ

У актавай зале шумна і весела. Усе з нецярпеннем чакаюць пісьменнікаў. У напружаным чаканні праходзіць гадзіна. Студэнты разглядваюць партрэты, якія вісяць на сцяне. Чуваць разважанні: Раман Ралан напісаў вельмі цікавую, захапляючую кнігу «Жан Крыстоф».

«Анры Барбюс — ці не італьянскі гэта пісьменнік?»

«А дзе зараз Маякоўскі?».

Праўда, гэтых студэнтаў трэба аднесці за лік рабфакаўцаў, але падобныя ёсць і ў БДУ.

Раптам у зале ўздымаюцца бурныя воплескі, авацыя. Усе ўстаюць...

На сцэне любімы паэт нашай моладзі **Александр Безыменскі**. Многія з нас яго бачаць у першы раз, многія на памяць ведаюць яго цэлыя паэмы, балады, вершы. А колькі песень яго напаўняюць маладыя сэрцы. І вось ён сам, той, хто вучыў нас «за кожнай дробяззю рэвалюцыю сусветную знайсці». Углядаемся ў твар: шчокі румяны, вочы чорныя, у валасах трапляецца блеск срэбра... А здаецца, што ён яшчэ такі малады. Безыменскі заяўляе:

— Я, як непаартаўны комсамолец, буду аплываць рады ленінскага комсамола, у які тыдзень таму назад прынялі майго сына.

Хочацца яшчэ і яшчэ апладзіраваць кожнаму яго слову, і асабліва, калі з нечуваным майстэрствам пачынае ён дэкламаваць уступ сваёй славутай паэмы «Трагедийная ночь», затым «Сноп и рубель», вершы аб комсамоле і іншыя і іншыя.

Праз некаторы час паяўляецца новая група пісьменнікаў, сярод іх крытык Каварскі, яўрэйскі драматург Кушняроў, паэт грузіі Чыкавалі, з Масквы Антакольскі, Маргарыта Алігер, Сідараў, Каваленка, Сяргей Міхалкоў, Шаўцоў, Сергей Гарадзецкі.

Каварскі робіць уступнае слова. У сваёй кароткай прамове ён адзначае, што трэці пленум праўлення саюза совецкіх пісьменнікаў, СССР мае гістарычнае значэнне. Работа пленума, — гаворыць ён, — ёсць сапраўдны акт творчага адзінства пісьменнікаў усей совецкай краіны.

Далей ён гаворыць, што за час, прайшоўшы з першага з'езда пісьменнікаў, прароблена вялікая работа, і аналіз творчасці беларускіх і башкірскіх пісьменнікаў сведчыць аб росце майстэрства пісьменнікаў, аб расшырэнні тэматыкі, аб павышэнні якасці.

Але ёсць і недахопы: не паказаны тыпы пролетарыяў — стахановцаў, няма сапраўднага паказу новага чалавека—героя, якому хацела-бы падражаць моладзь краіны социялізма. У гэтым значная віна крытыкі, якая не здолела накіраваць імкненні пісьменнікаў да раскрыцця актуальных тэм сучаснасці.

Пасля выступаюць паэты: Антакольскі, вядомы сваёй паэмай пра Парыжскую комуну. Кушнероў вядомы яўрэйскі драматург (яго п'еса — «Гірш Лекерт») чытае верш аб Маякоўскім. Зала замірае. Здаецца, тут няма ніводнага студэнта, але праходзіць 5—6 мінут і зноў грымяць воплескі. Кушнероў хоча сесці, але гарачыя воплескі зноў выклікаюць яго. За тым студэнтка Маскоўскага інстытута — маладая паэтэса — Маргарыта Алігер чытае свае вершы.

Свежасцю мовы і ўдзячнай сатырай прыкоўвае да сябе ўвагу паэт Сідараў і дзіцячы паэт Сергей Міхалкоў.

Пераклады вершаў на рускую мову народных беларускіх паэтаў Купалы і Коласа чытае паэт Гарадзецкі.

У сваім адказным слове студэнтка КУКІНА вельмі шчыра дзякавала паэтаў і заявіла ім ад усяго студэнцтва, што «мы чакаем вялікіх, высока мастацкіх палотнаў пра нашу маладосць, пра наш гераізм, пра нашага любімага і дарагога Іосіфа Вісарыёнавіча **СТАЛІНА**.

Сустрэча з пісьменнікамі надоўга застанецца ў нашай памяці. Гэта сустрэча будзе зыходным пунктам для лепшага вывучэння мастацкай літаратуры народаў СССР.

М. БЛІЗКІ.

Менск, друкарня «Звязды» Галоўліт 4667 Тыраж 1.500

Ч.В.А. адк. рэдактара ГУЗЕЙ.